# Аб’ектыўнае канструяванне мінулага – бясспрэчная аксіёма гістарычнай навукі

УДК 94(476) «1941/1944»



**Сяргей НОВІКАЎ, кандыдат гістарычных навук, дацэнт**

Сяргей НОВІКАЎ. Аб’ектыўнае канструяванне мінулага – бясспрэчная аксіёма гістарычнай навукі. Аўтар раскрывае працэс фарміравання навуковага і грамадскага наратываў у дачыненні да падліку максімальна дакладнай колькасці ахвяр масавых злачынстваў у раёне вёсак Вялікі і Малы Трасцянец у гады Вялікай Айчыннай вайны. Разглядае цяперашняе становішча крыніцазнаўчай базы і навуковых даследаванняў, спрабуе паказаць надзённасць задачы для айчыннай і замежнай гістарычнай навукі па выкарыстанні навуковых метадаў працы пры вывучэнні гісторыі месцаў генацыду грамадзянскага насельніцтва Беларусі ў 1941–1944 гады.

Ключавыя словы: Благаўшчына, Вялікі і Малы Трасцянец, генацыд грамадзянскага насельніцтва, Трасцянецкі лагер смерці (лагер смерці Трасцянец).

Siarhei NOVIKAU. Objective construction of the past is an indisputable axiom of historical science. The article explores the process of formation of scientific and social narratives regarding the most accurate calculation of the number of victims of mass crimes in the vicinity of the villages of Veliky Trastianets and Maly Trastianets near Minsk during the Great Patriotic War. The author looks into the current state of source studies and scientific research, urges the need for domestic and foreign historical science to apply scientific methods of work in studying the history of the places of the Nazi genocide of the civilian population in Belarus 1941–1944.

Keywords: Blagovshchyna, Veliky Trastianets and Maly Trastianets, genocide of civilian population, Trastianets death camp (death camp Trastianets).

Гісторыя нацысцкага генацыду беларускага народа – вялікая, грунтоўна вывучаная і добра вядомая вобласць даследаванняў у сучаснай айчыннай і замежнай навуцы. Аднак у ёй дагэтуль застаюцца некаторыя белыя плямы з прычыны недахопу крыніц, адсутнасці дакладных звестак ці нераспрацаванасці практычных методык вывучэння такіх тэм. У той жа час у цяперашняй публічнай дыскусіі шырока ўкараняюцца новыя звесткі, пры гэтым без грунтоўнага даследавання самога прадмета гісторыі. На наш погляд, дзейсная прапрацоўка гэтых важных даследчыцкіх аспектаў магчыма выключна пры правядзенні ўсебаковай навуковай дыскусіі аб трагедыі



## ПРА АЎТАРА

НОВІКАЎ Сяргей Яўгеньевіч.

Нарадзіўся ў 1954 годзе ў в. Радзіца Крупскага раёна Мінскай вобласці. Скончыў гістарычны факультэт Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя А.М. Горкага (1980).

З 1980 года працаваў выкладчыкам, старшым выкладчыкам, дацэнтам Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута замежных моў, з 1992 года – загадчыкам кафедры гісторыі, сусветнай культуры і турызму Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта.

Кандыдат гістарычных навук (1986), дацэнт (1990).

Аўтар больш за 400 навуковых прац, у тым ліку трох манаграфій і звыш 10 калектыўных прац па айчыннай ваеннай гісторыі, выдадзеных у Беларусі, Вялікабрытаніі, Германіі, Латвіі, Літве, Польшчы, Расіі і Украіне, а таксама вучэбных выданняў для агульнаадукацыйных устаноў і ўстаноў вышэйшай адукацыі.

Сфера навуковых інтарэсаў: гісторыя Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, айчыннае і замежнае ваеннае крыніцазнаўства, ваенна-гістарычная антрапалогія, германская гістарыяграфія, гістарыяграфічная і крыніцазнаўчая кампаратывістыка.

мірнага насельніцтва Беларусі ў 1941–1944 гады. Асабліва ў кантэксце таго, што ў 2021 годзе Генеральнай пракуратурай Рэспублікі Беларусь заведзена і расследуецца крымінальная справа па фактах здзяйснення нацысцкімі злачынцамі, іх саўдзельнікамі, злачыннымі фарміраваннямі генацыду мірнага насельніцтва ў гады Вялікай Айчыннай вайны *[1, с. 6]*.

Мэтай аўтара артыкула з'яўляецца спроба навуковага аналізу дакументальных фактаў для выяўлення максімальна дакладнай колькасці ахвяр нацысцкага генацыду ў раёне вёсак Вялікі і Малы Трасцянец у 1941–1944 гадах, паколькі да цяперашняга часу адсутнічае паразуменне адносна фактычных складнікаў гэтай лічбы, у тым ліку класіфікацыі ахвяр, метадалогіі іх падлікаў і методыкі атрымання канкрэтных лічбаў.

## Гісторыя пытання ў беларускіх навуковых працах і літаратуры

У акадэмічнай літаратуры гісторыя Трасцянецкага лагера смерці, які ў гады германскай акупацыі знаходзіўся на 11 км шашы Мінск – Магілёў, толькі ў 1990 годзе практычна ўпершыню была замацавана пад згаданай назвай у артыкуле ў энцыклапедыі «Беларусь у гады Вялікай Айчыннай вайны, 1941–1945». Трасцянецкі лагер смерці быў створаны нямецка-фашысцкімі акупантамі ў 1941 годзе каля вёскі Трасцянец Мінскага раёна для масавага знішчэння савецкіх грамадзян і ваеннапалонных, а таксама іншаземных грамадзян. Усяго ў ім загублена 206,5 тыс. чалавек. У лагер прывозілі таксама палітвязняў з Германіі, Аўстрыі, Польшчы, Францыі, Чэхаславакіі. Трасцянецкі лагер смерці па колькасці знішчаных людзей займае 4-е месца пасля Асвенціма, Майданека і Трэблінкі *[2, с. 590]*. Адзначым, што з сярэдзіны 1970-х гадоў у дачыненні да месца масавага знішчэння ў раёне в. Малы Трасцянец навукоўцы ўжывалі назву «канцлагер Трасцянец» *[3, л. 317]*.

Падкрэслім, што ў гістарычнай навуцы і акадэмічных выданнях гэтай тэме не надавалася належнай увагі да пачатку 1980-х гадоў *[4, с. 159–180; 5, с. 369–437]*. Сцвярджалася, што ў раёне в. Малы Трасцянец адбываліся масавыя пакаранні смерцю савецкіх грамадзян, а таксама грамадзян, прывезеных з Чэхаславакіі, Аўстрыі, Германіі і Польшчы. За гады акупацыі ў раёне в. Малы Трасцянец было знішчана больш за 206 тыс. чалавек *[6, с. 39]*.

Акадэмічная навуковая тэрміналогія ў дачыненні да тых трагічных падзей натыкалася на шырокую грамадскую думку, якая фарміравалася пад уплывам невялікай брашуры «Экскурсія ў Трасцянец» *[7]*, выдадзенай упершыню ў 1986 годзе 24-тысячным накладам, яе аўтар – супрацоўніца Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны А.Г. Ванькевіч. Дзякуючы ёй у шырокай грамадскасці замацоўвалася назва «канцэнтраваны лагер смерці – Малы Трасцянец» *[7, с. 7]*.

У 2003 годзе выходзяць дзве новыя працы, у якіх аўтары выкарыстоўваюць розныя назвы: калектыў архівістаў і гісторыкаў на чале з Г.Д. Кнацько ўжывае назву «лагер смерці Трасцянец» *[8]*. Як адзначаецца ва ўступным слове, сабраныя ў аднайменным зборніку дакументы і матэрыялы «не дазваляюць цалкам раскрыць гісторыю гэтага месца масавага знішчэння людзей» *[8, с. 3]*. Укладальнікі перакананы ў тым, што новая інфармацыя з дакументаў судовых працэсаў і паказанняў сведак будзе садзейнічаць больш дакладнаму вызначэнню механізмаў з'яўлення і функцыянавання падсобнай гаспадаркі паліцыі бяспекі і СД Мінска і масавых месцаў знішчэння ў ваколіцах сталіцы. Галоўнай мэтай выдання быў вызначаны ўсебаковы разгляд новых дакументальных крыніц як надзейнай магчымасці для больш дэталёвай рэканструкцыі драматычных падзей каля Малога Трасцянца ў 1942–1944 гады.

У гэтым жа годзе з'явілася новая праца «Тростенец», у якой аўтары-ўкладальнікі С.У. Жумар і Р.А. Чарнаглазава ўпершыню ўводзяць да месцаў масавых злачынстваў і працоўнага лагера каля вёсак Вялікі і Малы Трасцянец абагульненую назву «тэрыторыя смерці Трасцянец» *[9]*. Наступнае дзесяцігоддзе становіцца адметным у плане навуковай распрацоўкі гісторыі Трасцянца і спробы яго мемарыялізацыі ў агульнаеўрапейскай прасторы. У 2010-х гадах у грамадскім дыскурсе шырока выкарыстоўваюцца розныя назвы: «Трасцянецкі лагер смерці» *[10; 11; 12]*, «лагер смерці Трасцянец» *[13; 14]*, «Трасцянец» *[15; 16]*. У тагачасных працах аўтара

гэтых радкоў вядзецца размова пра працоўны лагер каля в. Малы Трасцянец і адно з найбуйнейшых месцаў масавых знішчэнняў – урочышча Благаўшчына, якія разглядаліся як у крыніцазнаўчым *[10]*, так і ў гістарычным аспектах *[11]*.

Аналіз гістарычных падзей у раёне вёсак Вялікі і Малы Трасцянец у еўрапейскім кантэксце ўпершыню быў праведзены на чатырохдзённай міжнароднай канферэнцыі «„Лагерь смерти Тростенец“ в европейском контексте», якая адбылася ў Мінску ў канцы сакавіка 2013 года *[13]*. Яе галоўным вынікам з’яўляўся не толькі разгляд гісторыкамі, архівістамі і музейшчыкамі наступстваў трагедыі ў «беларускім Асвенціме», але і прадстаўленне адразу двух праектаў – Г.А. Аксёнавай і Л.М. Левіна – па ўвекавечанні памяці ахвяр фашызму і захаванні гістарычнай дакладнасці на месцы масавага знішчэння ў раёне Трасцянца 206 500 грамадзян розных узростаў і нацый з васьмі дзяржаў Еўропы *[13, с. 48]*.

У 2014 годзе пачалася падрыхтоўка перасоўнай беларуска-германскай выставы, прысвечанай падзеям у раёне в. Вялікі і Малы Трасцянец. Адкрытая 8 лістапада 2016 года ў Гамбургу нямецкамоўная і 17 сакавіка 2017 года ў Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны беларускамоўная выстава «Лагер смерці Трасцянец – гісторыя і памяць» замацоўвала агульную тэзу аб тым, што Трасцянец з’яўляўся самым буйным лагерам смерці на тэрыторыі Савецкага Саюза *[14, с. 77]*.

Надзвычай важны этап па ўшанаванні памяці пачаўся 22 чэрвеня 2015 года: каля в. Малы Трасцянец з удзелам Прэзідэнта краіны была адкрыта першая чарга «Мемарыяльнага комплексу Трасцянец». Другая, ва ўрочышчы Благаўшчына, адкрывалася з удзелам кіраўнікоў трох краін – Беларусі, Аўстрыі і Германіі – 29 чэрвеня 2018 года. У першым выпадку на «Дарозе памяці» на спецыяльнай мемарыяльнай пліце ўвекавечана агульная лічба ахвяр у колькасці больш за 400 000 чалавек, знішчаных у Мінску і яго ваколіцах, з якіх больш за 206 500 чалавек – у лагеры Трасцянец. Важна мець на ўвазе, што апошняя лічба замацавана таксама на чатырох інфармацыйных шыльдах мемарыялу, адкрытых падчас згаданых афіцыйных мерапрыемстваў.

Міжнародны падыход у прадстаўленні гістарычных падзей у раёне Трасцянца таксама характэрны і для навукова-папулярнага выдання «Трасцянец» *[15]*, падрыхтаванага аўтарамі-ўкладальнікамі Н.А. Яцкевіч і М.Г. Нікіціным у 2018 годзе. Яны адзначаюць, што каля вёскі Малы Трасцянец Мінскага раёна існавала найбуйнейшая на акупіраванай нямецка-фашысцкімі захопнікамі тэрыторыі СССР нацысцкая «фабрыка смерці» – Трасцянец. Ахвярамі тут сталі 206,5 тыс. мірных жыхароў Беларусі, Расіі, Германіі, Аўстрыі, Чэхіі і іншых краін, а таксама ваеннапалонных *[15, с. 2]*. Сярод нечаканых звестак, якія ўводзяць у шырокі зварот (кніга выдадзена на трох мовах – беларускай, рускай, англійскай) аўтары, вылучаюць новую лічбу ахвяр агульнай колькасцю 125 тыс. чалавек, расстраляных і спаленых у Благаўшчыне *[15, с. 23]*, але не прыводзяць дакументальнага пацвярджэння гэтаму, як і не апісваюць методыку падліку колькасці ахвяр. Гэта выклікае пэўныя пытанні ў чытачоў, не кажучы пра спецыялістаў.

У 2016 годзе пабачыў свет грунтоўны дакументальны зборнік «Тростенец. Трагедия народов Европы, память в Беларуси», у ім гісторыкамі, архівістамі і музейнымі работнікамі прадстаўлены 255 дакументаў і матэрыялаў. Ва ўводзінах да зборніка, падрыхтаваных Н.А. Яцкевіч, А.Я. Далгоўскім і Г.Л. Левінай *[16, с. 7–22]*, выкарыстоўваюцца розныя назвы ў дачыненні да Трасцянца: лагер смерці Трасцянец, лагер Трасцянец, Трасцянецкі лагер. Паводле прапанаванага аўтарамі матэрыялу, «лагер Трасцянец – параджэнне нацысцкай сістэмы эксплуатацыі і знішчэння вялікіх мас людзей розных нацыянальнасцяў і веравызнанняў, камбінаваны варыянт месца масавага знішчэння і працоўнага лагера. Тут адбываліся спантанныя і раней спланаваныя забойствы людзей, а таксама працоўная эксплуатацыя вязняў» *[16, с. 7]*. Пры гэтым аўтары выказваюць тэзіс аб тым, што лагер Трасцянец уваходзіць у лік васьмі найбуйнейшых лагераў і месцаў масавага знішчэння ў Еўропе ў гады Другой сусветнай вайны: Асвенцім, Трэблінка, Белжэц, Хелмна, Майданек, Сабібор (усе на тэрыторыі Польшчы), Ясеновац (Харватыя); адзначаюць, што ўрочышча Благаўшчына ў сістэме Трасцянца стала інтэрнацыянальным месцам пахавання каля 150 тыс. ахвяр нацысцкага тэрору – грамадзян Беларусі і краін Заходняй Еўропы (Германія, Аўстрыя, Чэхаславакія, Польшча) *[16, с. 9]*.



**На Дні памяці ахвяр лагера смерці Трасцянец. 3 верасня 2022 года**

У канцы 2010-х – пачатку 20-х гадоў гісторыя Трасцянца практычна ўпершыню трапляе ў фокус увагі даследчыкаў новага напрамку – «ваеннай археалогіі», «археалогіі генацыду» і «археалогіі Халакосту» *[17; 18; 19; 20]*. Аўтарам гэтых наватарскіх падыходаў з'яўляецца загадчык цэнтра археалогіі Інстытута гісторыі НАН Беларусі кандыдат гістарычных навук В.І. Кошман. Пры правядзенні даследавання па ідэнтыфікацыі ахвяр на тэрыторыі лагера Малы Трасцянец археолаг прыходзіць да важнай высновы: артэфакты, выяўленыя ў час археалагічных работ на месцы падрыхтоўкі будучага мемарыялу, уяўляюць новы і ўнікальны від гістарычных крыніц, аналіз і інтэрпрэтацыя якіх дазваляе прадставіць якасна новы і аб'ектыўны погляд на трагедыю дзясяткаў тысяч людзей *[17, с. 10]*. Даследаванне аб'ектаў «археалогіі генацыду», «археалогіі Халакосту» на тэрыторыі Міншчыны прывяло гісторыка да вельмі важнай высновы аб неабходнасці выкарыстання менавіта археалагічнай методыкі пры вывучэнні ваенных аб'ектаў гісторыі Навейшага часу. Апроч таго, В.І. Кошман звяртае ўвагу на некарэктнасць падыходу да падліку колькасці ахвяр, якія вынікалі з матэрыялаў Надзвычайнай дзяржаўнай камісіі 1944 года *[20, с. 213]*.

Нават з прыведзеных згадак вынікае, што ў дачыненні да розных месцаў, дзе ў раёне вёсак Вялікі і Малы Трасцянец адбываліся масавыя забойствы людзей, ужывалася абагульненая геаграфічная назва – Трасцянец. У гэтым выпадку неабходна мець на ўвазе, што гістарычна трагічныя падзеі былі звязаны з урочышчамі Благаўшчына, Шашкоўка і калгаснай адрынай каля вёскі Малы Трасцянец. Заўважым, што кожная з гэтых назваў вынікае з дакументаў Беларускай рэспубліканскай камісіі садзейнічання ў рабоце Надзвычайнай дзяржаўнай камісіі (НДзК) СССР *[14, с. 116]*.

## Вывучэнне тэмы нямецкімі даследчыкамі

Берлінскі даследчык П. Коль у 1990 годзе першым увёў у шырокі ўжытак назву «беларускі Асвенцім» *[21, S. 91]*, і тым самым уключыў Трасцянец у спіс нацысцкіх лагераў смерці на тэрыторыі Еўропы.

Другі нямецкі гісторык, аўтар фундаментальнага даследавання пра германскую акупацыйную палітыку і палітыку знішчэння ў Беларусі ў 1941–1944 гады К. Герлах, спалучае месцы масавага знішчэння ў раёне Трас-

цянца і называе іх «лагерам смерці». На яго погляд, агульныя лічба ахвяр, у тым ліку дэпартаваных яўрэяў з Аўстрыі, Германіі і Чэхаславакіі, пахаваных ва ўрочышчы Благаўшчына, складала ад 40 да 50 тыс. чалавек. Заўважым, што нямецкі даследчык у той жа час пагаджаецца з лічбай ахвяр, знішчаных у калгаснай адрыне ў канцы чэрвеня 1944 года, але агульную колькасць ахвяр у раёне Трасцянца называе «каля 60 тысяч чалавек» з агаворкай «па грубых падліках» *[22, S. 770]*.

Важны ўклад у сучасную германскую гістарыяграфію ўнесла даследаванне нямецкага гісторыка П. Рэнтрап «Месцы масавых злачынстваў „канчатковага рашэння". Мінскае гета і месца знішчэння Малы Трасцянец» (Берлін, 2011) *[23]*. Даследчыца ставіць пад сумненне факт правядзення ў Благаўшчыне расстрэлаў неяўрэйскага насельніцтва і савецкіх ваеннапалонных пачынаючы ўжо з восені 1941 года. Яна адзначае, што працоўны лагер быў створаны на ўскрайку вёскі Малы Трасцянец (на тэрыторыі былога калгаса імя Карла Маркса) у канцы красавіка 1942-га. На працягу перыяду з мая па кастрычнік 1942 года ў Мінск і Малы Трасцянец (праз станцыю Калодзішчы. – *Аўт.*) прыбылі 16 эшалонаў з дэпартаванымі яўрэямі з Вены, Тэрэзіенштата, Кёнігсберга і Кёльна. З амаль 23 тыс. дэпартаваных у Мінск і Малы Трасцянец яўрэяў засталіся ў жывых 75 чалавек. Як лічыць даследчыца, агульная колькасць людзей, знішчаных у раёне Малога Трасцянца, складае значна менш за 60 тыс. чалавек, з якіх у Благаўшчыне было забіта больш за 30 тыс. яўрэяў *[23, S. 211]*. П. Рэнтрап адзначае, што дакладную агульную лічбу ахвяр у Малым Трасцянцы наўрад ці магчыма ўстанавіць, бо недастаткова дакументальных крыніц. Даследчыца прапануе лічбу, да якой прыйшлі ў сучаснай нямецкай гістарыяграфіі, – у раёне Трасцянца загінула не менш за 60 тыс. чалавек *[24, S. 165]*. Тут варта заўважыць, што ў час германскай акупацыі месца знішчэння ў Трасцянцы было адным з найбуйнейшых на акупаванай тэрыторыі Беларусі ў 1941–1944 гадах *[25, S. 21]*.

Такім чынам, нямецкія аўтары паспрабавалі не столькі аднавіць, колькі рэканструяваць дакументальна пацверджаную карціну трагедыі з мэтай паказу маштабаў знішчэння людзей у раёне вёсак Вялікі і Малы Трасцянец, галоўным чынам яўрэяў з Мінскага гета і многіх краін Еўропы, а таксама савецкіх ваеннапалонных, мінскіх падпольшчыкаў і партызан краіны, грамадзян з розных куткоў рэспублікі.

## Месцы масавых знішчэнняў: дакументальныя крыніцы

Асобныя дакументальныя матэрыялы аб трагічных падзеях у месцах знішчэння Благаўшчына, Шашкоўка і каля вёскі Малы Трасцянец упершыню былі апублікаваны ў 1965 годзе ў зборніку «Преступления немецко-фашистских оккупантов в Белоруссии. 1941–1944 гг.» *[26, с. 222–227]*. Наступны крок па зборы дакументаў у рамках гэтай важнай тэмы беларускія гісторыкі зрабілі праз некалькі дзесяцігоддзяў, у пачатку нулявых гадоў. Так, у 2003 годзе выходзіць зборнік з 117 дакументамі і матэрыяламі «Лагер смерці Трасцянец» пад рэдакцыяй вядучага архівіста Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь гісторыка Г.Д. Кнацько. У тым жа годзе творчы калектыў у складзе С.У. Жумара і Р.А. Чарнаглазавай падрыхтавалі навукова-папулярнае выданне «Трасцянец» з 27 дакументамі і 49 ілюстрацыйнымі матэрыяламі. На наш погляд, заслуга ўкладальнікаў дзвюх гэтых прац у тым, што яны, з аднаго боку, імкнуліся ўвесці ў шырокі ўжытак новыя пісьмовыя крыніцы, выяўленыя ў архівах Беларусі, а з другога – спрабавалі ўнесці сваю лепту ў справу навуковай ацэнкі гістарычных падзей, якія мелі месца ў Трасцянцы. Галоўным навуковым здабыткам першага зборніка можна лічыць увядзенне ўніфікаванай абагульненай назвы: «лагер смерці Трасцянец» – найбуйнейшае на тэрыторыі Беларусі месца масавага знішчэння «савецкіх ваеннапалонных, яўрэяў Беларусі і заходнееўрапейскіх краін, падпольшчыкаў і партызан, жыхароў Мінска, арыштаваных у якасці заложнікаў» *[8, с. 3]*. Аўтары-ўкладальнікі другога зборніка прапанавалі ў якасці абагульненай назвы фактычна зусім новую дэфініцыю: «тэрыторыя смерці Трасцянец».

Неабходна памятаць, што ў навуковай літаратуры цяпер выкарыстоўваецца назва, якая спалучае ў сабе адразу некалькі месцаў масавага знішчэння і ўтрымання людзей на прылеглай да вёсак Вялікі і Малы Трасцянец тэрыторыі: урочышча Благаўшчына – месца масавых расстрэлаў у 1942–1943 гг.; працоўны лагер – месца

ўтрымання вязняў лагера для выкарыстання ў якасці працоўнай сілы ў падсобнай гаспадарцы паліцыі бяспекі і СД г. Мінска (1942–1944); урочышча Шашкоўка – месца масавага спальвання людзей (1943–1944); або побач з працоўным лагерам каля в. Малы Трасцянец – месца расстрэлу і спальвання людзей (чэрвень 1944). Важна разумець, чаму Трасцянец становіцца цэнтральным месцам знішчэння на ўсходніх тэрыторыях якраз у Беларусі, а таксама чаму прыйшлося адмовіцца ад першапачатковай ідэі стварэння ў Магілёве на беразе Дняпра месца масавага знішчэння накшталт Асвенціма, а шукаць такое месца ў ваколіцах Мінска *[23, S. 186]*.

Сярод дакументальных матэрыялаў ёсць дакумент выключнай важнасці – заключная даведка, прадстаўленая не Мінскай абласной, а Рэспубліканскай камісіяй – дакумент № 73: «Из справки начальника отдела Белорусской республиканской комиссии ЧГК СССР Г.Л. Логинова о массовом истреблении гражданского населения и военнопленных в Минске и его окрестностях в 1941–1944 гг.» ад 25 жніўня 1944 года *[27, с. 116–117]*. Гэта ў поўным сэнсе гістарычная даведка, якая, на наш погляд, павінна з'яўляцца адзінай агульнапрынятай крыніцай для сучаснай айчыннай і замежнай гістарыяграфіі, замацоўваючы рэальныя маштабы вынішчэння людзей у раёне вёсак Вялікі і Малы Трасцянец: «Минск, 25 августа 1944 г.



**Лакалізацыя месцаў размяшчэння ям-магіл на месцы масавых расстрэлаў у Благаўшчыне**

Большой Тростенец, лес Благовщина. Обнаружено 34 ямы-могилы.

1. Длина ямы 35 м, шир[ина] 5 м, гл[убина] 3 м. В среднем в каждой яме похоронено 3675 чел. Люди, привезенные из Германии, Чехословакии, Австрии и других государств. В 34 ямах-могилах похоронено 150 000 человек.

Малый Тростенец, лагерь.

1. Обнаружен колхозный сарай, сожженный с людьми, в количестве 6500 человек. По подсчету и медицинскому определению.

Вблизи деревни Малый Тростенец обнаружена печь-крематорий.

По показаниям свидетелей, сожжено советских жителей с 1943 г. до прихода Красной Армии 50 000 человек» *[27, с. 116–117]*.

З дакумента вынікае: у 34 ямах-магілах, выяўленых у лесе Благаўшчына каля Вялікага Трасцянца, пахавана 150 000 чалавек (менавіта такую лічбу ўводзіць Р.Л. Логінаў). Але чаму, напрыклад, не падтрымалі намаганні старшыні Мінскай абласной камісіі Героя Савецкага Саюза генерал-маёра В.І. Казлова, які на першым пасяджэнні Мінскай абласной камісіі НДзК СССР ад 25 ліпеня 1944 года настойваў на тым, што «па самых мінімальных падліках у раёне лагера Трасцянец фашысцкімі людаедамі знішчана 546 тысяч чалавек» *[8, с. 105–106; 16, с. 100]*? Звернемся да сценаграмы пасяджэння Мінскай абласной камісіі НДзК СССР ад 13 жніўня 1944 года. На ім прысутнічаў прадстаўнік НДзК СССР генерал-палкоўнік акадэмік М.Н. Бурдэнка. Але згаданая лічба ў сценаграме не фігуруе ў якасці прадмета абмеркавання, наадварот, акадэмік тлумачыць гэты момант на пасяджэнні, сцвярджае, што правяраў лічбы, прадстаўленыя тав. Логінавым, і што «ён правільна падлічыў» *[16, с. 113]*. Пры гэтым адзначае: «калі мы прымаем сапраўдныя лічбы, мы павінны ўсё улічыць» *[16, с. 113]*. Такой была мова дакументаў. Гэта азначае, што навуковы пошук не спыняецца, яго неабходна працягваць, выкарыстоўваючы, з аднаго боку, прынцып максімальнай паўнаты крыніц і новых падыходаў «ваеннай археалогіі», а з другога – кіруючыся прынцыпам «юрыдычнай калізіі».


-2-

– 33 – 24

УРОЧИЩЕ ДРОЗДЫ

Обнаружена 1 яма

1/ Длинна ямы 400 метров ширина 2,5 метра глубина 3 метра где похаронено 10,000 чел.

БОЛЬШОЙ ТРАСТИНЕЦ ЛЕС БЛАГОВЩИНА

Обнаружено 34 ямы могилы

Длинна ямы 34 м. ширина 5 м. глубина 3 м. в среднем похаронено в каждой яме 3,675 чел.

В 34 ямах похаронено 150,000 чел.

Люди привезенные из Германии, Чехословякии, Австрии и друг. государств.

~ 125 тыс.

МАЛЫЙ ТРАСТИНЕЦ ЛАГЕРЬ

Обнаружен колхозный сарай сожженный с людьми в количестве 6.500 ч. по подсчету и медицинско экспортному определению.

В близи Малый Трастенец обнаружена печь КРЕМАТОРИЙ

по показаниям свидетелей сожжено советских граждан за 1943 г. до прихода Красной Армии.

50,000 чел.

Справку составил:

НАЧ. ОТДЕЛА УЧЕТА И РАССЛЕДОВАНИЯ ЗЛОДЕЯНИЙ СОВЕРШЕННЫХ НЕМЕЦКО-ФАШИСТСКИМИ ЗАХВАТЧИКАМИ ПО БЕЛОРУССКОЙ ССР /ЛОГИНОВ/

25-VIII-45 года
гор. Минск

**З даведкі начальніка аддзела Беларускай рэспубліканскай камісіі Р.Л. Логінава ад 25.08.1944 года**

## Аб методыцы падліку максімальна дакладнай колькасці страт

Навуковы падыход сведчыць, што даследчыкам неабходна зыходзіць з гістарычных дакументаў, якія замацоўваюць дакладныя лічбы ў дачыненні да месцаў масавага знішчэння людзей у раёне вёсак Вялікі і Малы Трасцянец (так у дакуменце вызначае лакалізацыю месцаў на мясцовасці Р.Л. Логінаў). Разгледзім яго метад падлікаў, на падставе якога была атрымана лічба аб агульнай колькасці ахвяр у Трасцянцы. Заўважым, што ў дакуменце лічба атрымліваецца ў выніку падлікаў трох месцаў масавага знішчэння – урочышчаў Благаўшчына і Шашкоўка, а таксама калгаснай адрыны. Адпаведна дакументу – гэта 206 500 чалавек (з якіх былі расстраляны і спалены: у Благаўшчыне 150 тыс., у Шашкоўцы – 50 тыс., у калгаснай адрыне – 6,5 тыс. чалавек).

Як адзначаецца ў дакуменце, такая колькасць стала вынікам падлікаў аднаго чалавека – Р.Л. Логінава. У час абмеркавання папярэдніх вынікаў масавых забойстваў грамадзянскага насельніцтва і савецкіх ваеннапалонных у Мінску і яго ваколіцах ён кіраваўся метадам «усярэдненага памеру». На справе гэта азначала пошук сярэдняй лічбы колькасці ахвяр, якія маглі б размяшчацца ў адным кубічным метры ямы-магілы: такой лічбай стаў каэфіцыент сем чалавек на 1 куб. м. Зыходзячы з гэтага, Логінаў правёў агульныя падлікі ва ўрочышчы Благаўшчына, дзе пасля першага наведвання гэтага месца 14 ліпеня члены Надзвычайнай камісіі выявілі 34 ямы-магілы (траншэі) дакладных фізічных памераў: даўжыні, глыбіні і шырыні. Як вынікае з вышэйзгаданага дакумента, у сярэднім у кожнай з ям было пахавана 3675 чалавек. Гэта лічба вынікае з падлікаў, у аснове якіх ляжаць звесткі аб фізічных памерах ям-магіл, занатаваных у час працы камісіі цягам цэлага тыдня з 14 па

21 ліпеня 1944 года. Відавочна, што для гэтага была ўзята максімальная глыбіня ям, роўная 5 м. У такім выпадку, у выніку рашэння матэматычнай задачы на перамнажэнне вядомых велічынь (даўжыні – шырыні – глыбіні) атрымліваецца агульны аб'ём усіх 34 ям-магіл, які складае 25 459 куб. м: максімальная колькасць ахвяр, якая магла быць пахавана ў Благаўшчыне цягам расстрэлаў з вясны 1942 па восень 1943 года ў гэтым выпадку атрымалася б у колькасці 178 213 чалавек. Аднак паводле падлікаў Логінава гэта лічба складае 150 000 чалавек. Бліжэй да яе з'яўляецца лічба, калі ў 1 м куб. будзе ўтрымліваць не 7, а 6 трупаў забітых людзей: пры такім каэфіцыенце лічба складае 152 754 чалавекі. Гэта лічба значна бліжэй па сваім значэнні да зафіксаванай у выніковым дакуменце НДзК ад 25 жніўня 1944 года. Заўважым ад сябе, што размова ідзе пра максімальныя лічбы, якія на той час былі выкарыстаны для абгрунтавання формулы разлікаў.

Звернем увагу чытача таксама на тое, што паводле пратакола агляду месцаў знішчэння людзей у ваколіцах вёскі Малы Трасцянец у 34 ямах-магілах (траншэях), ва ўрочышчы Благаўшчына ўдзельнікі камісіі правялі кантрольныя шурфы толькі ў пяці месцах, адпаведна: у траншэях № 1, 3, 6, 11, 34 *[28, с. 55–56]*. Як вынікае з прыведзеных звестак, траншэя № 3 мела глыбіню не 5, а 4,5 м. З пратакола таксама вынікае, што траншэі 12, 13 і 18 мелі іншую глыбіню, чым 5 м, адпаведна: 4,5; 4,5 і 6 м. Але ж адкуль паходзяць такія звесткі, калі ў згаданых траншэях не былі праведзены праверачныя шурфы.

Асобна падкрэслім, што пры ажыццяўленні такіх даследаванняў цяперашняя «ваенная археалогія» патрабуе абавязковага ўліку памеру слоя грунту, якім забітыя ахвяры засыпаліся зверху. Толькі з улікам гэтых аб'ёмаў можна весці пошук агульнай лічбы расстраляных і пахаваных. Тым больш што гэта месца пастаянна выкарыстоўвалася для масавых расстрэлаў, таму патрабавалася таксама максімальна надзейная засыпка верхняга грунту. Паводле дакументаў НДзК, а таксама вопыту раскопак падобных пахаванняў 52 АСПБ МА Рэспублікі Беларусь, памеры грунтавой засыпкі масавых магіл перыяду 1941–1944 гадоў складалі ў сярэднім 1,0–1,5 м *[20, с. 211]*. Як бачым, у такім выпадку максімальная лічба колькасці ахвяр ва ўрочышчы Благаўшчына патрабуе далейшага даследчыцкага аналізу, прычым з улікам не толькі звестак НДзК, але і нямецкіх дакументальных крыніц. З вядомых аўтару нямецкіх матэрыялаў вынікае, што ў час дзейнасці «зондэркаманды 1005-Цэнтр» па ліквідацыі слядоў нацысцкіх злачынстваў ва ўрочышчы Благаўшчына ў канчатковым выніку было знішчана, эксгуміравана і спалена фактычна амаль 100 000 чалавек *[11, с. 25; 29, с. 12]*.

Такім чынам, беларускія гісторыкі распачалі новы этап у даследаванні найбольш складаных старонак нацысцкага генацыду і масавага знішчэння беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Грамадскасць Беларусі чакае аб'ектыўных вынікаў працы, аснову якой павінны складаць навукова верыфікаваныя дакументальныя крыніцы, сучасныя методыкі падліку ахвяр і імкненне даследчыкаў да рэканструкцыі гістарычнай ісціны.

*Артыкул паступіў у рэдакцыю 15.08.2022 г.*

## [ СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ ]


1. Геноцид белорусского народа = Genocide of the Belarusian people: информационно-аналитические материалы и документы / Генеральная прокуратута Республики Беларусь; под общей редакцией А.И. Шведа. – Минск: Беларусь, 2022. – 175 с.
2. Раманоўскі, В.П. Трасцянецкі лагер смерці / В.П. Раманоўскі // Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне, 1941–1945: энцыклапедыя / рэдкал. І.П. Шамякін (гал. рэд.) і інш. – Мінск, 1990. – С. 590.
3. Романовский, В.Ф. Немецко-фашистская оккупационная политика и ее крах в Белоруссии (1941–1944 гг.): дис. ... д-ра ист. наук: 07.00.02 / В.Ф. Романовский. – Минск, 1974. – 380 л.
4. Беларуская ССР у гады Вялікай Айчыннай вайны // Беларуская Савецкая Энцыклапедыя: у 12 т. / гал. рэд. П.У. Броўка. – Мінск, 1975. – Т. 12. Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка. – С. 159–180.
5. Белоруссия в годы Великой Отечественной войны // История Белорусской ССР. – Минск, 1977. – С. 369–438.
6. Фашистская политика геноцида, грабежа и «выжженой земли» в 1943 г. // Всенародная борьба в Белоруссии против немецко-фашистских захватчиков в годы Великой Отечественной войны: в 3 т. / гл. редкол.: А.Т. Кузьмин и др. – Минск, 1984. – Т. 2. – С. 31–48.

7. Ванькевич, А.Г. Экскурсия в Тростенец / А.Г. Ванькевич. – Минск: Полымя, 1986. – 32 с.
8. Лагерь смерти Тростенец. Документы и материалы / сост. В.И. Адамушко и др.; под ред. Г.Д. Кнатько. – Минск: НАРБ, 2003. – 292 с.
9. Тростенец / сост. С.В. Жумарь, Р.А. Черноглазова. – Минск: Полиграфоформление, 2003. – 103 с.
10. Новікаў, С.Я. Мінскае гета і Малы Трасцянец: новае даследаванне / С.Я. Новікаў // Беларускі гістарычны часопіс. – 2012. – № 3. – С. 25–33.
11. Новікаў, С. Урочышча Благаўшчына – месца масавага знішчэння людзей на тэрыторыі Беларусі / С. Новікаў // Беларускі гістарычны часопіс. – 2013. – № 10. – С. 21–27.
12. Новікаў, С. Праблематыка нацысцкага генацыду ў раёне вёскі Малы Трасцянец у 1942–1944 гадах у святле найноўшых і ранейшых даследаванняў / С. Новікаў // Przeglad Srodkowo-Wschodni. – 2019. – Nr. 4. – P. 523–556.
13. Лагерь смерти «Тростенец» в европейской памяти: материалы Международной конференции, 21–24 марта 2013 г. / перевод с немецкого П. Бельского. – Минск: Лимариус, 2013. – 63 с.
14. Каталог выставки «Лагерь смерти Тростенец. История и память» / Международный образовательный центр (Дортмунд), Минский международный образовательный центр им. Йоханнеса Рау, в сотрудничестве с фондом «Памятник убитым евреям Европы» (Берлин) / авторы текста: А. Ойленбург, А. Керпель-Фрониус, У.Ноймеркер. – Дортмунд: ИББ; Минск: ИББ, 2016. – 246 с.
15. Яцкевіч, Н.А. Трасцянец. Трагедыя народаў Еўропы = Тростенец. Трагедия народов Европы = Trastsianets. The tragedy of the people of Europe / Н.А. Яцкевіч, М.Г. Нікіцін. – Мінск: Беларуская Энцыкл. імя П. Броўкі, 2018. – 128 с.
16. Тростенец: трагедия народов Европы, память в Беларуси: документы и материлы / сост. В.И. Адамушко и др.; редкол.: В.В. Андриевич (гл. ред.) и др. – Минск: Беларус. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2016. – 520 с.
17. Кошман, В. Да пытання аб ідэнтыфікацыі ахвяр лагера Малы Трасцянец (па матэрыялах археалагічных даследаванняў) / В. Кошман // Беларускі гістарычны часопіс. – 2020. – № 5. – С. 4–11.
18. Кошман, В.И. Фалеристический материал с места массового уничтожения населения в урочище Благовщина (Малый Тростенец) в 1942–1943 гг. / В.И. Кошман // Весці НАН Беларусі. Серыя гуманітарных навук. – 2021. – Т. 66, № 4. – С. 432–442.
19. Кошман, В.И. Трагедия урочища Благовщина: анализ огнестрельного материала по итогам археологического исследования / В.И. Кошман // Гісторыка-археалагічны зборнік. – 2021. – Вып. 35. – С. 188–199.
20. Кошман, В.И. Место массового уничтожения жителей Дзержинского гетто в контексте археологических находок и письменных свидетельств (предварительные результаты) / В.И. Кошман // Гісторыка-археалагічны зборнік. – 2022. – Вып. 36. – С. 206–213.
21. Kohl, P. „Ich wundere mich, dass ich noch lebe“: sowjetische Augenzeugen berichten / P. Kohl. – Gütersloh: Verlagshaus Gerd Mohn, 1990. – 319 S.
22. Gerlach, Ch. Kalkulierte Morde. Die deutsche Wirtschafts- und Vernichtungspolitik in Weißrussland 1941 bis 1944. / Ch. Gerlach. – Hamburg: Hamburger Edition, 1999. – 1232 S.
23. Rentrop, P. Tatorte der „Endlösung“. Das Ghetto Minsk und die Vernichtungsstätte von Maly Trostinez / P. Rentrop. – Berlin: Metropol, 2011. – 256 S.
24. Rentrop-Koch, P. Maly Ttostinez – ein Landgut als Vernichtungsstätte / P. Rentrop-Koch // Im Schatten von Auschwitz. Spurensuche in Polen, Belarus und der Ukraine: begegnen, erinnern, lernen / Hrsg. von Martin Langebach und Hanna Liever. – Bonn: BPB, 2017. – S. 152–169.
25. Kohl, P. Das Vernichtungslager Trostenez. Augenzeugenberichte und Dokumente / P. Kohl. – Dortmund: IBB, 2003. – 112 S.
26. Акт минской областной комиссии о массовом истреблении советских граждан на территории гор. Минска и его окрестностей немецко-фашистскими захватчиками в 1941–1944 гг. от 13 августа 1944 г. // Преступления немецко-фашистских захватчиков в Белоруссии. 1941–1944 гг. – Минск: Беларусь, 1965. – С. 222–227.
27. Из справки отдела Белорусской республиканской комиссии содействия в работе ЧГК СССР Г.Л. Логинова о массовом истреблении гражданского населения в окрестностях Минска в 1941–1944 гг. // Лагерь смерти Тростенец. Документы и материалы / сост. В.И. Адамушко и др.; под ред. Г.Д. Кнатько. – Минск: НАРБ, 2003. – С. 116–117.
28. Протокол осмотра мест уничтожения людей в окрестностях деревни Малый Тростенец // Тростенец: трагедия народов Европы, память в Беларуси: документы и материалы / сост. В.И. Адамушко и др.; редкол.: В.В. Андриевич (гл. ред.) и др. – Минск: Беларус. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2016. – С. 52–57.
29. Новікаў, С. Ліквідацыя слядоў масавых нацысцкіх злачынстваў у Беларусі ў 1943–1944 гг.: да пытання аб дзейнасці «зондэркаманды 1005-Цэнтр» / С. Новікаў // Беларускі гістарычны часопіс. – 2019. – № 5. – С. 3–13.